Самапомач
Samapomač

Беларускі папулярна-гаспадарскі часапіс

Год VII. Вільня, Май 1938 г. № 5 (79).

Аб чым піша «Самапомач»:

Рэдакцыя і адміністрацыя: Вільня (Wilno), Завальная вул. 1.

Страганярства

Аб страганярстве ці аб страганах гавораць у нас людзі ўжо больш-менш два-тры гады. Што гэта слова азначае, а што сапраўды за ім крыецца?

Страгаӥ — у даслоўным значэньні гэта рынгачная будка для дробнага ў ёй гандлю. Новачаснае значэньне гэтага слова расшырылася да разуменьня яго як гандлю наагул; практычна-ж усё страганярства накіравалася да заахвочваньня беззямельнага і малазямельнага сялянства займацца гандлем і наагул жыць „з алаўком у руцэ“ — ці йнакш — да гаспадарскага пераўзгадаваньня найшырэйшых і найбольш упасьледжаных слаёў насельніцтва.

Магло-б з гэтага каму здавацца, што страганярства гэта добрая справа, вартая пазнаньня і насьледаваньня.

Так яно можа й было-б, калі-б страганярства не дасталася ў нас пад кіраўніцтва яўных і схаваных польскіх эндэкаў, якія самую думку страганярства з грунту выкрывілі: замест быць школай жыцьця, наша страганярства пад эндэцкім кіраўніцтвам сталася інструмантам расавае ненавісьці. І гэта зусім не выпадкова, а з выразным жаданьнем адвярнуць увагу ад сапраўдных балячак нашага жыцьця і ад спосабаў лячэньня іх.

Нікому не сакрэт, як вёсцы нашай сяньня дакучае малазямельле. Лякарства на гэту бяду знае кожнае дзіця: патрэбна тут парцэляцыя двароў і наагул усіх лішкаў зямлі. Аднак кіраўнікі страганярства аб зямельнай справе зусім маўчаць. Замест гэтага яны ўсім стараюцца ўгаварыць, што прычынай недастаткаў у нашай беларускай вёсцы ёсьць жыдоўскі гандаль ці прасьцей кажучы ўсяму быццам вінаваты жыды і таму іх быццам перад усім трэба згэтуль так ці гэтак высадзіць.

Пад шумок гэтак зразуменай „абароны ад жыдоўскага вызыску“ кіраўнікі страганярскага руху ўсё больш і больш прывозяць сюды рамесьнікаў і гандляроў польскіх. Адным махам забіваюць яны гэтак ня то што двух, але трох зайцаў: 1. у некаторых мясцох фактычна выганяюць жыдоў, узмацняючы іхным коштам у нас элемэнт польскі, 2. даюць працу польскім прыездным гандляром і рамесьнікам і 3 захоўуюць ад парцэляцыі панскія, у 95 прац. польскія, у нас двары.

А што-ж з усяго гэтага астаецца нашаму малазямельнаму і беззямельнаму селяніну беларускаму?

Прыгледзьмася папарадку.

1. Выпіраньне элемэнту жыдоўскага. У імя чаго? У імя перабіраньня гандлю ў с в а е рукі? Згода! Але ці-ж можна рабіць гэта палкай, каменем, ілжой—і ўсё гэта ў імя гэтак званага „хрысьціянскага гандлю“, апёртага на звычайнай „перамозе“ — мацнейшага над слабейшым? — На кожным кроку вытыкаецца пры гэтым „несалідныасьць“ гандлю жыдоўскага. Дапусьцім, што і гэта здараецца. Але, працэнтова ўзяўшы, ці-ж не часьцей ужо сяньня гэта спатыкаецца ў гандлі як-раз няжыдоўскім? А што найважнейшае — ў што можа ператварыцца такі „хрысьціянскі“ гандаль на выпадак, калі

перастане яго награваць сяньняшняя аранжэрыйная атмосфэра? Аб тым-жа, якая „здабыча“ для нашага перанаселенага сяла з таго, што замест выцісьненага гандляра жыдоўскага сядзе прыездны гандляр польскі — гаварыць няма чаго.

2. Страганы як варштат працы для прыездных гандляроў ці рамесьнікаў польскіх: ясна, што тут карысьць толькі аднастароньняя і то выключна для тых-жа гандляроў і рамесьнікаў польскіх.

3. Захаваньне ад парцэляцыі двароў, густа расееных паміж беларускімі вёскамі: прыняўшы пад увагу малазямельле нашай вёскі, захаваньне ў цэласьці сумежных двароў гэта больш чым яўная некарысьць тэй-жа нашай вёскі.

Падсумоўвуючы ўсё сказанае аб страганярстве і ня ўходзячы тут у ацэнку ягонай тэорэтычнай вартасьці, трэба сказаць, што сягоньняшні спосаб уводжаньня яго ў нас у жыцьцё:

1. распальвае няведамы дагэтуль беларускаму сялянству процiжыдоўскі настрой (антысэмітызм):

2. памагае асельвацца ў нас польскім гандляром і рамесьнікам, і што найважнейшае,

3. адварочвае ўвагу нашага беларускага сялянства ад натуральнае патрэбы безадкладнага правядзеньня зямельнай рэформы.

Ці ўсё гэта ёсьць у інтарэсе нашага беларускага селяніна, хай кожны скажа сам за сябе.



Jak žyviecca ŭ Švecyi

Švecyja heta adna z najstarejšych dziaržavaŭ u Eŭropie, bo isnuje ŭžo kala 1.200 (tysiača i dźvieście) hadoŭ. Pałoža na jana na poŭnačy Eŭropy, na h. zv. Skandynaŭskim paŭvostravie, zajmaje prastor u 449.000 kv. klm Hranica Švecyi ciahniecca na prastory 9 817 klm., z jakich bolš 80 prac. idzie bieraham Bałtyckaha mora (na ŭschodzie i paŭdni), a rešta — sušaj: na zachadzie kala Norvehii i na poŭnačy kala Finlandyi. Usiaho nasielnictva ŭ Švecyi naličajuć tolki 6 mil. 200 tys. čałaviek, a znača na 1 kv. klm. ŭ siarednim vypadaje 14 čałaviek. Hetak redkaje zasialeńnie prastoru Švecyi tłumačycca tym, što vialikija prastory kraju zajmajuć lasy, hory, vaziory i mora. Ziamli prydatnaj pad pasieŭ (arominy) jość u Švecyi tolki 3.725.000 ha, što sastaŭlaje krychu bolš jak 8 prac. ahulnaha abšaru. Jašče mienšy pracent zajmajuć tut sienažaci i paśbiščy — 1.091 ha ci $2^1/_2$ prac.

Lasy zatoje zajmajuć u Švecyi 60 prac. ahulnaha abšaru. Pazvalaje heta Švecyi być najbolšym u Eŭropie pradaŭcom usiakaha lesnaha mataryjału, jaki na ŭsich rynkach cenicca vielmi doraha. Druhim pavažnym pryrodnym bahaćciem Švecyi jość žaleznaja ruda, jakaja tak-ža ŭ vialikaj miery vyvozicca zahranicu. Kamienny vuhal tut taksama sustrakajecca, ale jaho nia tolki nia vyvoziać na prodaž zahranicu, ale jšče i kuplajuć.

Niedastatak čornaha vuhla švedy razumna zamianili „vuhlem biełym“, heta znača siłaj vady pry pomačy vodnych turbinaŭ. Hetak atrymali jany biazcennyja zapasy elektryčnaj enerhii, jakaja daje im nia tolki vyhodnaje aśviatleńnie, ale i nia mienš vyhodnuju pahonnuju siłu da roznych mašynaŭ u haspadarcy j fabrykach.

Vidać z usiaho hetaha, što pryroda nia była dla Švecyi lišnie ščodraj. A adnak kraj hety słyvie z vialikaha ŭva ŭsim dastatku. Dajšli da hetaha švedy praz pracu, pilnaść i aśvietu. Što heta nia pu-

ВЫЛЯГАНЬНЕ ЗБОЖА

Сьцюдзёная сёлетняя вясна не карысная для расьліннасьці. А калі настануць раптоўныя ўпалы, дык усе расьліны пачнуць расьці вельмі шыбка. У гэткіх выпадках тканкі расьлінных клетак, шыбка растучы, не пасьпяваюць адзеравянець і таму бываюць тоненькія, гібкія і слабыя. Гэта даводзіць да таго, што расьліны такія, азімыя і яравыя, каласістыя і стручковыя, а нават канюшыны — вылягаюць. Зьявішча гэта агульна-ведамае і такое вылягшае збожа ніколі ня дасьць добрага ўраджаю, працэнт азадкаў у збожы бывае вялікім. Калі-ж выляганьне здарыцца прад красаваньнем, дык расьліны пачынаюць гніць і зусім прападаюць. Прад выплываньнем сільна палёгшае збожа найлепш скасіць і высушыць на сена. Тымбольш што на гэткім месцы ў тым-жа йшчэ годзе можна пасеяць на зялёную пашу ці на кішонку якую небудзь мешанку, конскі зуб, кукурузу і г. д.

У кожным разе выляганьне збожа ёсьць шкодным: нішчыць а прынамся абніжае ўраджай і ўносіць непарадак у севазварот. З гэтае прычыны трэба канешна знаць прычыны гэтага выляганьня і да іх не дапускаць.

Як ужо сказана, выляганьне пагражае тады, калі збожа разьвіваецца вельмі хутка, а тканкі клетак не пасьпяваюць адзеравянець. Усё гэта памагае разрастацца зялёным, з прыроды сваей слабым часьцям расьліны, асабліва калі ў глебе шмат азоту, а мала фосфару і потасу, калі збожа было засеена густа, калі пагода трывае цёплая і сырая, калі само збожа расьце ў ценю дрэваў ці высокіх будынкаў.

З другога боку ў тых самых кліматычных і глебавых варунках адзін гатунак збожа вылягае, а другі — таго самага збожа — не вылягае. Гэта знача, што выляганьне ці невыляганьне збожа залежа ад ягонага гатунку. Таму перад засяваньнем збожа на глебе багатай на азот заўсяды бесьпячней пагнаіць яе ўгнаеньнямі фосфарнымі і паташавымі. Спосаб сяўбы на гэтулькі важны, што рэдка пасеенае збожа, да якога мае доступ сонца й паветра, асабліва-ж збожа пасеенае з сеялкі радкамі з поўначы на паўдзень, значна лепш умацоўваецца і пасьля не вылягае, чым гэта бывае з збожам засееным густа.

Часта аднак паміма ўсіх асьцярожнасьцяў збожа ўсё-ж апынецца загрожаным. Прадвесьнікам такой небясьпекі зьяўляецца празмернае загушчэньне

styja tolki słovy, vidać choć-by z zrazumiełych dla našaha čałavieka ŭradžajaŭ. I tak z adnaho hektara švedy źbirajuć: pšanicy*): 23 q (11), žyta — 19 q (11), jačmieniu — 18 q (12), bulby — 142 q (114), burakoŭ — 347 q (210).

Jašče bolšyja ślady vysokaj haspadarskaj kultury možna bačyć u haspadarskaj žyviołahadoŭli. Nie zvažajučy na tak mały pracent užytkovaj ziamli — arominy i sienažaciaŭ z paśbiščami nia całych 11 prac. tady jak napr. u siańniašniaj Polščy adpaviedny pracent arominy i sienažaci z paśbiščami dasiahaje až ličby 66! — to adnak na 100 ha ziamli tut vypadaje: koniaŭ**) — 11 (15), skaciny — 61 (40), śviniej — 28, aviec — 10 (12).

Vysokaja kultura kraju vidać adnak nia tolki ŭ haspadarcy, ale i ŭ žyćci ahulnym. Formaj dziaržaŭnaha žyćcia Švecyi jość konstytucyjnaja monarchija: na čale kraju staić karol, jaki kiruje žyćciom u kraju pry pomačy dvupałatnaha parlamantu (byccam sojmu i senatu), vybiranaha na padstavie demakratyčnaha zakonu, h. zn. u vybarach: ahulnych, tajnych, roŭnych, biespasiarednych i praparcyjanalnych. Na kolki daśpieła tut hramadzianstva da demokratyčnych paradkaŭ, vidać z stałaści palityčnych pierakanańniaŭ: ad 1920 h. ŭładu ŭ kraju trymaje koalicyja (parazumleńnie) liberalnych partyjaŭ (socyjalistaŭ i sialanskich narodnikaŭ). Najsłabšymi-ž partyjami źjaŭlajucca tut kamunisty i monarchisty. Usie palityčnyja partyi ŭ Švecyi lehalnyja i majuć poŭnuju svabodu ŭ pastupańni. Na publičnaje sabrańnie tut nia treba nijakich dazvołaŭ: sabrać takoje sabrańnie moža kožny, a zamiest prośby ab dazvoł chopić zvyčajnaje paviedamleńnie palicyi. Lišnie dadavać, što j samyja sabrańni tut heta nie demahohičnyja łajanki ci pustyja abiacanki, a račovyja spravazdačy ci ahulnyja

*) ličby pobač u dužkach ( ) aznačajuć uradžaj taho-ž zboža ŭ Polščy.

**) ličby ŭ dužkach ( ) pobač aznačajuć lik adpaviedniaj žyvioły ŭ Polščy.

(уруненьне), пры чым збожа пераходзіць у сыты цёмна-зялёны колер, калівы становяцца тонкімі і таму гібкімі, слабымі. Гэта ўсё азначае, што наблiжаецца небясьпека выляганьня. Каб да яго не дапусьціць раньняй вясной загусьцеўшая рунь барануецца цяжкімі баронамі, каторыя выцягваюць часьць расьлін з карэньнем; затое рэшта расьлін лепш укараняецца (грубее і мацнее), забесьпячаючыся гэтак прад выляганьнем. Чым гусьцейшая рунь тым мацней выбараноўваецца. На пульхных-жа глебах замест баранаваньня ў такіх выпадках стасуецца валаваньне цяжкім гладкім валам. Урэшце, калі збожа ўжо перарасло і яму пагражае выляганьне, дык адзіным ратункам ёсьць скошываньне вяршкоў збожа. Але гэта ўжо спосаб, для пачатачнікаў прынамся, рызыкоўны: касіць трэба высака і высьцерагацца, каб не пашкодзіць каласка, які знаходзіцца ўжо ў похве.

Усё гэта былі прычыны выляганьня нутраныя. Апрача іх бываюць яшчэ прычыны мэханічныя. Маем тут на ўвазе віхры, палучаныя з сільным дажджом. Калі няма надзеі на тое, што палёгшыя маладыя расьлінкі падыймуцца прад тым як пачнуць выплываць, дык іх трэба скасіць і высушыць на сена. Калі-ж збожа паляжа пасьля таго, як ужо адкрасуе (адцьвіце), дык яно ня дасьць, праўда, зярнят першага сорту (добра разьвітых, высьпеленых), але крыху зярнят горшага гатунку ўсё-ж дасьць.

Найменш шкодным ёсьць выляганьне прад самым жнівом. Калі зерне ўжо дасьпелае, дык збожа трэба зараз-жа скасіць, каб салома не загнілася, а ўраджай зярнят можа быць зусім добры.

Паз.

Гаспадарскае рыбацтва

Рыбацтва, побач з паляваньнем, ніколі не ўважалася чамусьці ў нашага беларускага селяніна як заняцьце поўнавартаснае. На працягу вякоў улажыўся пагляд, што хто заняўся рыбацтвам, у таго гаспадарка будзе храмаць. Колькі ў гэтым было праўды за нашых дзядоў-прадзедаў — разьбіраць тут ня будзем. У кожным разе што было ўчора, таго няма сягоньня. „Учора“ гаспадарыў наш беларус на загоне шырэйшым, „сягоньня-ж“ ягоныя патомкі гэты загончык падзялілі найменш на дзьве часьці, а што будзе „заўтра?“ Больш таго: шукаючы спосабу пражыцьця, чалавек наш сягоньня стараецца выкарыстаць на

narady; sabrańniaŭ ahitacyjnych, švedy nia znajuć, bo kožny z ich šmat čytaje i tamu maje vyrablenyja pahlady. Kali havorym ab čytańni, dyk treba zatrymacca ŭ kolkich słovach ab aśviecie ŭ Švedaŭ naahuł. Abaviazak ahulnaha navučańnia isnuje tut zdaŭna i tamu niahramatnych tut niama. Pačynajuć vučycca dzieci ŭ hetak zvanych pradškollach. Pačatkavyja 7-mi klasnyja škoły jość u kožnaj hminie, jakija tut značna mienšyja, čym hminy našy. Pa pačatkavych škołach tyja z dziaciej, jakija majuć być ramieśnikami ci astacca na ziemlarobskich haspadarkach, pavinny jšče davučvacca ŭ specyjalnych 2-hadovych škołach, prahrama jakich u kožnym vypadku asobnaja i dapasavanaja da paźniejšaha zaniaćcia hadunćoŭ. Urešcie dziela ahulnaha raźvićcia švedzkaj moładzi vialikaje značeńnie majuć narodnyja ŭniversytety.

Jak pašyrana ŭ Švecyi aśvieta, vidać z słoŭ adnaho švedzkaha dziejača, jaki zajaviŭ, što: „u nas hłuchaniemy i ślapy ŭmiejuć čytać i pisać. Siła našaj demakracyi ŭ tym, što našy masy majuć dostup uva ŭsie navukovyja ŭstanovy; naš urad i naša hramadzianstva abjaviła vajnu alkaholu“.

Aśvieta i kultura ŭ Švecyi heta nia pusty huk, ale istota samaha žyćcia. Prajaŭlajecca heta štodzień u adnosinach čałavieka da čałavieka: adzin druhoha aceńvaje tut pavodle taho, jak chto vykonyvaje svaje abaviazki ŭ adnosinach da dziaciej, baćkoŭ, susiedziaŭ i ŭsiaho hramadzianstva. U rezultacie hetaha na švedzkich viaźnicach vielmi časta vyvieśvajecca biely ściah — znak što ŭ viaźnicy hetaj niama nivodnaha viaźnia. Pakražy ŭ Švecyi blizu niaviedamyja. Valizka pakinienaja na vahzale čakaje na svajho ŭłaśnika. Na vulicach stajać sotni roveraŭ, motocykletak, aŭtamabilaŭ i nichto ich nie čapaje. Zamkoŭ na haspadarskich budynkach niama — i jany niepatrebnyja.

Mylaŭsia-b adnak toj, chto dumaŭby, što hetki vysoki rovień etyčny pry-

свой спосаб кожную пядзю зямлі, карчуючы пасекі, заворываючы прыродныя сенажаці й пасьбішчы. Плошча ўрабляных грунтоў гэтак павялічваецца, але карысьць з іх найчасьцей не аплачвае ўложаных трудоў,з тае простае прычыны, што ня можна вымагаць,каб кожная глеба была прыгоднай пад плуг і барану. Што з прыроды празначана на сенажаць, лес ці пасьбішча, тое калі й даецца дастасаваць да вымогаў польнае гаспадаркі, дык вымагае значна большага ўкладу грошаў і працы, чым гэта можна зрабіць звычайным толькі плугам. Урэшце, пры найлепшым стараньні знайсьці вольны прастор пад польную гаспадарку спатыкаюцца мясцы, якія дагэтуляшнімі спосабамі выкарыстаць ніяк не даюцца. Маю тут на ўвеце розныя падмоклыя, замкнёныя ў сабе катлавіны, на якіх ня можна залажыць ані сенажаці, ані пасьбішча, ані тымбольш лесу ці ворнага поля. Такія мясцы найчасьцей называюцца „няўжыткамі“ а сапраўды гэта прыродныя мясцы пад закладаньне ставоў дзеля гаспадарскай гадоўлі рыбы, перад усім карпаў. Вымагае гэта пэўнага прыгатаваньня, аб якім рэчовы артыкул зьмясьціў анагдай Аўг. Ластоўскі ў Tyg. Roln.“(№ 15—16). Уважаем дзеля таго за патрэбнае пазнаёміць з гэтым артыкулам і чытачоў „Самапомачы.“

„...Вельмі часта здараецца — піша А. Ластоўскі — асабліва ў вёсцы скомасаванай, што не адзін гаспадар наракае на падмоклыя сенажаці, пасьбішчы, праз каторыя працякае ручаёк ці рэчка. Трэба над гэтым затрымацца і падумаць, якую карысьць можа даць гаспадару такая сенажаць або такая рэчка. І тады прыйдзе думка закладаньня меншых і большых ставоў, каб у іх пасьля гадаваць рыбу.

У нашых варунках найлепш гадаваць карпаў, бо яны хутка растуць і найлепш выкарыстываюць багацтва ставу. А да таго на карпаў даволі лёгка сягоньня знайсьці і купца. У ставы ўпускаецца („насаджваецца“) маладыя карпы або аднагодкі, або двугодкі. Вага кожнага карпа-аднагодка бывае каля 25 грамаў (40 штук на 1 кілё), а вага карпа-двугодка выносіць 100—200 грамаў (на кілё 5—10 штук).

Матарыял рыбны (аднагодкі ці двугодкі, трэба купляць ужо ў пачатку красавіка і ў гэту-ж пару ўжо ўпускаць у ваду. Памятаць пры гэтым трэба, што толькі матар'ял куплены ў пэўнай салідной фірме дае тавар здаровы і забесьпячае набыўца ад стратаў.

---

chodzie sam saboj. Nie! Na heta patrebna vychavańnie. I tamu kožnaje dzicia ad samaha ŭžo zarańnia maje starannuju apieku z boku ŭradu i samaŭradu. Dziciačyja sadki i achronki ŭ Švecyi pašyrany nia tolki ŭ haradoch, ale i pa vioskach. Kožnaja maci-švedka zusim spakojnaja za toje, što jejnaje dzicia budzie mieć zapeŭnieny dostup da aśviety i znojdzie pracu.

Ale švedy apiakujucca nia tolki dziaćmi — budučymi hramadzianami kraju: jany nia mienš ruplivyja i ab tych, jakich prycisnuŭ ciažar „siomaha kryžyka“. Kožny šved. z miesta ci z vioski, kali jon konča 65 hod svajho žyćcia, maje zapeŭnienuju staraść, z boku taho samaha ŭradu i samaŭradu: idzie ŭ „Dom dla starych“, dzie maje ŭsie vyhody, ab jakich naš čałaviek nia śmieje i padumać: śvietłyja, čystyja pakoi, supolnyja śviatlicy, radio, usie hazety, kino, sezonny teatr; kali patrabujuć adziežu, mohuć sabie vybrać koler i kroj. Jaduć 4 razy ŭ dzień. A prysłuha? U adnym takim „Domie“ dla 450 asob, prysłuhi jość až 150 ludziej. Akramia taho kožny starac atrymoŭvuje jšče drobnuju sumu hrošaŭ na svaje raschody... Zrazumiełaja reč, što kožny, majučy hetak zabiaśpiečanuju staraść, pracuje česna i nie patrabuje krašci.

Žyćcio ludziej pracy ŭ Švecyi tak-ža ŭrehulavana. Rabotnik pracuje tut 8 hadzin u dzień; daŭžej pracavać nia možna. Ziemlarob pracuje ŭ dzień 10 hadzin. Ci heta budzie žnivo ci zima, pa 10 hadzinach pracy ziemlarob švedzki kančaje pracu, myjecca, pieraapranajecca i zajmajecca sportam, čytaje knižki, słuchaje radyja, jedzie ŭ kino ci teatr. Pry hetym pa hadzinach pracy ŭsie sabie roŭnyja: niama roźnicy stanu, a jość tolki roźnica vieku. Piaršynstvo ŭsiudy majuć staryja i małyja. Paza hetym usie sabie roŭnyja.

Ziamielnaje zakonadaŭstva Švecyi davoli ŭstarełaje, ale cikavaje. Reformy ziamielnaj u Švecyi dahetul nia było. Toje-ž, što dzie časam niešta ŭ hetym kirunku

такіх шкоднікаў і грыбковых хваробаў, якіх гэтымі простымі сродкамі зьнішчыць ня здолеем. Тут прыходзяць нам на помач апырсківаньні хэмічнымі сродкамі. Ёсьць іх вельмі шмат розных фірмаў і пад рознымі назовамі, але дзеля таго, што яны вельмі дарагія, то нават пералічываць іх ня будзем. З прасьцейшых сродкаў проціў грыбковых хваробаў успомнім: „бардоскую“ жыжку*), якой апырсківаем дрэвы рана вясной, перад лісьцём і як дрэвы перацьвітуць. Проціў кузурак і гусьвіцаў ужываюць г. зв. „Зелень Гарыскую“**), якой апырсківаем дрэва, калі распусьціцца лісьцё і зьяўляюцца кветкі.

Апошнім часам людзі стараюцца замяніць гэтыя сродкі яшчэ танейшымі. І вось чытаем у фаховых часопісах, што робяцца спробы апырсківаньня дрэваў штучнымі пагноямі, напр. патасовай соляй; калі яна 25 прац. а то ў стасунку 2½ кл. на 100 літ. вады. Соль распускаецца ў цёплай вадзе і тады ўліць яе ў 100 л. вады і добра разьмяшаць. Перад ужываньнем трэба сумесь перацадзіць. Апырсківаць рана вясной і пасьля адцьвітаньня.

Іншыя апырсківаюць у сябе сьлівы проціў вельмі шкоднай кузуркі г. зв. місачніка, каінітам, бяручы на 100 літ. вады 10 15 кл. каініту і кропіць гэтай сумесяй сьлівы два разы: у лютым і ў сакавіку.

А. В.

---

*) 1 кілё меднага купарвасу ($CuSO_4$) распушчаецца ў 10 літрах вады; пасьля 1 клг. гашанай вапны распушчаецца ў 10 літрах вады. Усё гэта мяшаецца і ўліваецца ў 80 літр. вады. Цечу гэту трэба разводзіць у начыньнях каменным, або дзераўляным, бо мэталёвыя разьядаюцца.

**) „Зелень“ купляем у аптэках. Разводзім так: 15 дэка (150 грамаў) „Зелені“ на 100 літраў вады і клею з 1 кіля жытняй мукі. Перад ужываньнем трэба добра перамяшаць.

У садку вясной.

Каб праканацца, у якім дрэнным стане знаходзяцца нашыя сады. як яны запушчаны—досыць праехаць у якім хочачы кірунку 50—100 кілёмэтраў. З напатканых садоў можа знойдзецца адзін, які выглядае так, як трэба; рэшта ж гэта гора.

Каб зьмяніць гэтыя нашыя запушчаныя сады на прыгожыя, на высокаўраджайныя й даходныя, дзеля гэтага не патрэбны ані вялікія выдаткі і многа працы, а трэба мець толькі крыху добрай охвоты і сьведамасьці. Кожны дзень досыць патраціць для малых садкоў 5—10 мінут, а для большых — паўгадзіны ці гадзіну часу — і садкі нашы стануцца не да пазнаньня: харошыя па выглядзе і даходныя ў гаспадарцы. Дык адкінем-жа нашу нядбаласьць і зробім так, каб нашыя сады сталі ў адным радзе з найлепшымі на сьвеце!

Самыя галоўныя недахопы нашых садоў наступныя:

1. Густая пасадка пладовых дрэў.

2. У многіх садох паміж добрых дрэў пасаджаны нядобрыя, маладаходныя гатункі.

3. У маладых і старых дрэў кароны запушчаны, густыя, самі сабе шкодна заценяюць; сукі крыжуюцца, адзін з другога абдзіраюць кару. У старых дрэў шмат нявыразанага сухога сучча. Усё суччо, тонкае і грубое, як і сам пень, пакрыты рознымі паростамі — мохам і лішайнікамі, кара старая вісіць стрэп'ямі, несаскоблена; самыя дрэвы ў значным ліку дуплястыя і дуплы не заліты, расшчэплены і нязьвязаны.

4. Дрэвы ніколі ня белены вапнай і не абпырсківаны хімічнымі сродкамі проціў рабакоў.

5. Многія сады растуць на запушчанай пожні і ніколі ня ўгнаіваюцца; у тых-жа садох, дзе зямля абра

бляецца, заўсёды кругі каля пня заросшы бываюць пустазельлем.

Паралічаныя недахопы трэба цяпер-жа адразу паправіць, бо іх моцна адчувае наш кішэнь.

Прарэджваньне густых карон у садовых дрэваў. Дзе сады загушчаныя, там ніколі ня можна мець пладоў добра вырашчаных і смачных. У нормальна заложаных садох яблыні і йгрушы ніколі ня будуць пасаджаны бліжэй дрэва ад дрэва ў квадрат, як восем з палавінай да дзесяцёх ($8^1/_2$ да 10) мэтраў.

У палове месяца сакавіка (марца), яшчэ ў канцы зімы, прыступаем да прарэджваньня карон пладовых дрэў і робім гэта да канца м ца траўня (мая). Восеньню, перад наступленьнем маразоў і зімой у нашых кліматычных варунках абрэзку рабіць ня можна, бо яна тады шкодна адбіваецца на здароўі абрэзаных дрэў.

Выразаем у кароне ўсе сухія сукі, далей — усе сукі, што крыжуюцца паміж сабой і ўсе горшыя, што заценяюць карону. Піла да абрэзкі мусіць быць вострая, зрэз — гладкі. Пасьля пілы, зрэз трэба зглядзіць вострым нажом ці стругом і замазаць садовай мазьзю ці клустай цэгляной глінай, зьмешанай з пятай часьцю на меру сьвежага каровяга гною. Калі мова аб зразаньні, дык яно ня сьмее быць ані за нізкое, ані за высокае; гэта знача зразаць сук трэба над **самым кругам**, які знаходзіцца ў тым месцы, дзе сук выходзіць з пня, ці з другога грубейшага сука. Бо калі мы зробім зрэз ніжэй круга, дык зробім вялікую рану, якая доўга не зарасьце; таксама ня можна зразаць сука і многа вышэй круга, бо тады торчачы адрэзак (пень) ня можа зарасьці, трэпіцца, у рану заходзіць вада, сам сук загніваецца, гніль пераходзіць у ўсё дрэва, у дрэве робіцца дупло, і само дрэва, дзеля неправідловай абрэзкі, без пары гіне.

Доўгія пянькі пры абрэзцы астаўляюць людзі нясьведамыя ў садоўніцтве, што рабіў калісьці й я сам, з тэй добрай людзкой думкай, што доўгія пянькі ня так балючыя для дрэва, як кароткі па крузе абрэз.

Барацьба са шкоднікамі ў садзе

Барацьбу пачынаем ужо зімой, або якнайраней вясной. Перад усім абходзім ўсе дрэвы, нават дзікія, якія растуць у садзе, або каля саду і старанна зьбіраем з іх гнёзды матылёў і кузурак, якія скрываюцца ў сухім лісьцю, вісячым дзе-недзе на дрэвах. Пэўныя, шкодныя матылі складаюць яечкі на тоненькіх галінках дрэваў, густа зьлепліваючы іх паміж сабою ў пярсьцёнак. Кожная кропка гэтакага пярсьцёнка, гэта паасобнае яечка, з якога вясной выйдзе гусьвіца, а дзеля таго, што іх разам будзе некалькі соцен, то могуць аб'есьці ўсё маладое лісьцё на дрэве. — Вось гэтыя **«пярсьцёнкі» трэба абіраць і паліць.**

Некаторыя шкодныя кузуркі зімуюць пад нягладкай і палопанай карой; хочучы іх зьнішчыць, трэба кару абскрабсьці тупым нажом або сярпом. Скрабаць трэба асьцярожна, каб ачысьціць дрэва ад нягладкага, адстаючага (няжывога) пласту кары, але не закрануць спадняга, белага, жаўтаватага або зялёнага пласту.

Рана вясной, калі толькі дажджы не перашкаджаюць, трэба дрэвы пабяліць вапнай. Гэткае бяленьне карысна тым, што нішчыць розны мох, які, растучы на дрэве, цягне з яго сокі. Апрача таго бяленьне забівае кузуркі і іх яйкі, каторыя знаходзяцца ў шчэлках кары. Беленыя дрэвы ня лопаюць, што часта здараецца з дрэвамі нябеленымі, калі вясной дні ўжо крыху цёплыя, а ночы марозныя: тады сокі ажыўленыя з паўднёвага боку сонечным цяплом, пачынаюць у дрэве рухацца, а пасьля ўночы замярзаюць і расьпіраюць кару.

Белім дрэвы пэндзлем даволі густой сумесяй гашанай вапны, гліны, каравячага гною і попелу.

Але гэтых захадаў яшчэ не даволі. Ёсьць шмат

(½ прац.), бордской цечай з дадаткам 100 грам. парыскай зелені на сто літраў цечы. Чацьверты раз абпырсківаем паўпрацэнтнай (½ прац.) бордоскай цечай, калі плады дарастуць да велічыні ляскавага гарэха.

Пры другім, трэцім і чацьвертым абпырсківаньні можна замест бордоскай цечы ўзяць каліфорнійскую цечу з дадаткам на кожныя сто літраў цечы, дзьвесьце пяцьдзесят (250) гр. алавянага аршэніку.

Каб у нашых садох найменш было ўсякіх шкодных рабакоў, кожны уласьнік саду мусіць у садку мець хоць пару дуплянак ці скрыначак на гнёзды для шпакоў. Ведаю добра з сваей уласнай практыкі, як многа шпакі дапамагаюць садаводзтву.

Сады мусяць быць чыстымі ад траў і розных сарнякоў. Пожні ў садку ніколі ня можа быць, зямля мусіць быць на плошчы ўсяго саду ўзорана. На чорнай зямлі каля дрэў палосы мусяць быць перакопаны. Сады трэба ўгнаіваць. Гной трэба класьці зьверху і пасьля няглыбака аборываць і прыкрываць. Хто мае ў сябе вішні і сьлівы, якія цьвітуць, а ня родзяць пладоў, той павінен пад кожнае дрэва пасыпаць ад аднаго да двух кілёграмаў вапны пад усей каронай і за каронай сантымэтраў па восемдзесят (80) і перакапаць з зямлёй.

У старых садох вельмі часта і многа прыходзіцца спатыкаць дрэў зусім высахшых, каля пнёў якіх ёсьць ня мала адросткаў дзікіх. З гэтых адросткаў трэба выбраць адзін лепшы і прышчапіць, а стары сухі пень зрэзаць. Садовая практыка паказала, што куды лепш прышчапіць такі дзікі адрасток, чым выкарчовываць старое дрэва і на месца яго садзіць маладое.

Іван Сікора.

Тымчасам відзім, як шкодна для дрэва абрэзка сукоў з доўгімі пянькамі.

Ачышчаньне дрэва. Заліваньне дуплаў. Пасьля абрэзкі сукоў кароны, на старых дрэвах трэба абавязкава, найлепш у вільготную пагоду, саскрабаць зусюль, дзе толькі ёсьць: мох, лішайнікі і старую кару. У маладых садох дрэвы рэдка маюць паросты моху і лішайнікоў. Мох і лішайнікі вельмі шкодныя для дрэў тым найперш, што яны растуць на дрэве і жывяцца ягонымі сокамі і па другое, у моху і лішайніках гнезьдзяцца розныя жывыя шкоднікі, якія аб'ядаюць лісьцё, цьвет і плады, а апрача таго мох і лішайкі перахоўваюць і разносяць розную заразу пладовых дрэваў і самых пладоў.

Стрэп'е старой кары, аж да здаровай, трэба саскрабсьці, бо ў шчэлінах яе плодзяцца, хаваюцца і зімуюць тысячы розных шкоднікаў пладовага дрэва. Саскробываць старую кару можна скрабачкамі, вялікім ня зусім вострым тоўстым нажом, ці проста куском зялеза (куском старога зьежджанага падрэза). На старых грушах цьвёрдую кару найлепей саскрабаць скобляй.

Падчас саскробваньня з дрэва моху, лішайнікаў, старой кары, унізе пад дрэва трэба разаслаць старую, але цэлую, нядзіравую посьцілку, на якую будуць спадаць з дрэва ўсе паскробкі і іх можна будзе сабраць і спаліць. Калі-ж іх не сабраць і не спаліць, дык рабакі з іх павылазяць і ўзноў успаўзуць на дрэва.

У садох, дзе дрэвы высокія і моцна абросшыя мохам і лішайнікамі, да вярхоў дрэў трудна са скрабачкай далезьці, там для зьнішчэньня паростаў трэба абавязкава ў працягу двух-трох гадоў кожную вясну перад набуханьнем пупушак (не пазьней!) абпырскаць дрэвы шасьціпрацэнтным (6 прац.) растворам зялезнага купарасу (siarczanu żaleza). Мацнейшага як і слабейшага ад 5 прац. раствору ня можна ўжываць: першы спаліць многа ліставых пупушак і цьвету, а другі будзе зусім безкарысны, бо за слабы.

Раствор прыгатаўляецца так: бярэцца драўляная

пасудзіна, уліваецца ў яе дваццаць літраў цёплай рэчнай ці вазёрнай вады, у якую апускаецца палатняны мяшочак з шасьцю кілёграмамі зялезнага купарасу і палошчыцца аж да таго часу, пакуль купарас зусім не разойдзецца. Потым гэты раствор мяшаецца з васьмідзесяцьцю (80) літрамі мяккай летняй вады.

Раствор прыгатаўляецца залежна ад патрэбы — ў большай, ці меншай колькасьці літраў вады.

Адзін кілёграм зялезнага купарасу каштуе каля 30 грашоў.

Адкрытыя дуплы ў старых дрэвах трэба чыста вычысьціць, пасьля насыпаць у іх сухога дробнага ці шчапанага каменя і заліць да верху густа разьведзенай вапнай ці цэмэнтам. Пасьля гэтага дрэва перастане ў сярэдзіне гніць і зьверху рана скора зарасьце, калі толькі само дрэва не запушчана і мае добры выгляд.

Шмат на якіх пладовых дрэвах можна знайсьці сухія, зморшчаныя маленькія яблычкі і сухое, скручанае павучыньнем лісьцё, якое моцна трымаецца праз зіму да самай вясны. Яблычкі гэтыя і лісьцё трэба канешна сабраць і спаліць: яблычкі разносяць плямісты грыбок, які пляміць і псуець нашыя плады, а ў скручаных лісточках зімуюць чарвячкі (гусеніцы) баярышніцы, якія з наступленьнем цёплай вясьняной пагоды выходзяць з зімовых гнёздаў і пачынаюць аб'ядаць лісьцё і цьвет. Дзеля гэтага, як яблычкі, так і скручанае лісьцё трэба зьняць да прыходу цяпла.

Зімой і вясной, да часу распусканьня лісьця ў садку, на тоненькіх як гусінае пяро сучкох можна часта спаткаць шэранькія, быццам з маку зьлепленыя колцы (напарсткі). Колцы гэтыя на вошчуп цьвёрдыя. Іх трэба зьняць, або з сучком зрэзаць і спаліць, бо гэта яйкі матыля персьценіцы. З кожнага яечка выйдзе вясной досыць вялікі паласаты чарвячок, падобны да капуснага, які адразу прыймецца аб'ядаць маладыя лісточкі на дрэвах.

Падчыстка і пабелка дрэваў. Па заканчэньню абрэзкі дрэваў і падчысткі ад моху і лішайнікаў, трэба ў усіх дрэвах у садзе пабяліць усе пні і гоўстыя сукі, як толькі можна дастаць, вапнай, з дамешкай сьвежага каровяга гною.

Вапна да бяленьня мусіць быць нягашаная, гэта знача яшчэ ў каменьнях, а ня ў муцэ. Старая вапна нічога ня варта. На кожнае вядро разьведзенай як сьмятана вапны дадаём палавіну ($^1/_2$) кілёграма сьвежага каравяку. Абмазка з каровяком двойчы даўжэй трымаецца на дрэвах. Пабелку дрэў найлепш рабіць раньняй вясной.

Вапнаваньне дрэў карысна для саду тым: пад канец зімы пабеленыя дрэвы ў ясныя дні моцна ад сонца не награваюцца і на дрэвах ня бывае спаленых сонцам мясцоў, на якіх праз гады два-тры злазіць кара, і дрэвы потым стаяць з чорнымі палосамі, без кары.

Вапнай дэзынфікуем дрэва, залепліваем усе шчэлкі ў кары і разам жывых шкоднікаў і іхнія яйкі. Кара пасьля пабелкі становіцца мякчэйшай, ня сьціскае дрэва як бляха, і дрэва лепей расьце.

Хто мае сад стары і дрэвы пасаджаны вельмі густа, там няма іншай рады, як толькі горшыя, слабейшыя дрэвы выкінуць, а тыя, што астануцца, лепш на прасторы пачнуць расьці і лепш аплацяцца.

Абпырсківаньне пладовых дрэў. Абпырсківаем пладовыя дрэвы на тое, каб зьнішчыць рабакоў і розныя заразныя хваробы пладоў і дрэў.

Абпырсківаем дрэвы чатыры разы ў год. Першы раз абпырсківаем садоўніцкай карболінай 5 прац., у дзень ціхі і не марозны, у канцы сакавіка ці ў пачатку красавіка (да часу распусканьня пупушак), каб зьнішчыць яечкі розных шкоднікаў; другі раз 1 прац. (адна працэнтным) растворам бордоскай цечы з дадаткам сто (100) грамаў парыскай зелені, перад самым цьвіценьнем, як толькі пупушкі заружавеюць. Гэта самае важнае абпырсківаньне на зьнішчэньне грыбка плямістага. Трэці раз абпырсківаем поўпрацэнтнай

Многа рыбных хвароб паўстае і з прычыны розных шкоднікаў, якія нападаюць (насядаюць) на карпа звонку: на скуру, на плыўкі, на жабры. Ад шмат якіх з гэтых шкоднікаў можна абараніць нарыбак, купаючы яго прад тым як упусьціць у стаў, у $2^{1}/_{2}$ прац. растворы кухоннай солі ($2^{1}/_{2}$ кілёграма солі на 100 літраў пераваранай вады) у працягу 15—20 мінутаў. Высьцерагацца толькі пры гэтым трэба начыньня цынковага і цынкаванага. Найлепш рабіць гэта ў бочках ці цабэрках драўляных ці ў такіх-жа карытах. Рыбкі слабыя і неадпаведныя да гадоўлі, праўда, ад такой купелі згінуць, але лічыцца з гэтым ня можна, бо яны напэўна згінулі-б і ў ставе. Успомніць таксама трэба, што ў адзін стаў найлепш упускаць маладняк толькі аднаго гатунку, напр. толькі аднагодні, або толькі двугодні, а ня ўпускаць аднагодкаў і двугодкаў разам. Тымбольш ня можна ўпускаць у стаў такіх дросных рыбаў, як шчупак, а нават карась і — лін. Гэты апошні часам упускаецца дзеля паўнейшага выкарыстаньня пажыўнага багацьця ставу, але ня можна такіх ліноў пускаць шмат. Толькі ў ставох з праточнай вадой рэчнай, куды паміма адпаведнага забесьпячэньня жалезнай кратай усё-ж могуць часам з вадой пранікнуць такія дробныя дзікія рыбы, як акуні, плоткі, яжгуры і г. д. — радзяць, але толькі да карпаў аднагодкаў — упускаць і колькі аднагодніх шчупачкоў. У гэткім выпадку шчупакі, як мясажэрныя, вылаўліваюць і выядаюць рыбу дзікую, ня шкодзячы аднак ні ў чым маладым карпам і памагаючы лепш выкарыстаць стаў.

Вядучы гадоўлю карпа, трэба ўсё запісываць, ці йнакш — весьці дняўнік, упісваючы: колькі штук рыбкаў і якога веку ўпушчаны ў стаў, якая была агульная вага гэтых рыбкаў, скуль яны былі ўзяты і колькі яны каштавалі. Гэткія запісы можна рабіць у звычайным сшытку і яны могуць быць вельмі карысны.

Калі стаў вельмі зарос травой, і рознымі вадаростамі, дык ня трэба тады нават карпаў асобна дакормліваць. Сьцьверджана гэта было ў рыбнай гаспадарцы ў Варапаеве, Пастаўскага пав., дзе з упушчаных вясной 800 штук карпаў (нарыбку), не дакармліваных праз цэлае лета, увосені некаторыя з гэтых рыбаў дасягалі вагай да 3 клг.

Калі-ж гадаваныя карпы ўлету маюць быць кормленыя лубінам ці якой іншай пашай, дык стаў мусіць мець чы-

---

robicca, robicca tolki z volnaj ruki. Usia rešta majontkaŭ jak była ŭ rukach šlachty kaliś, tak znachodzicca i siahońnia, pierachodziačy z pakaleńnia ŭ pakaleńnie. Cikava adnak toje, što takaja ziamielnaja majemaść pierachodzić z baćki tolki na syna. Kali-ž u siamji niama syna, dyk tady majontak takoha haspadara pierachodzić na kaznu, jakaja jaho i parceluje. Umovy, na jakich kolonist atrymoŭvuje svaju parcelu, vielmi vyhodnyja: jon musić mieć hatoŭki tolki čaćviertuju čaść vartaści nabyvanaj kalonji (chutaru) i vykazacca ŭmieńniem haspadaryć. Heta proba ŭmieńnia palahaje na tym, što chutar addajecca spačatku byccam nie na ŭłasnaść, a tolki na 4-och-hadovuju probu. Kali za hetyja 4 hady kandydat vykaža, što haspadaryć umieje, dyk jon pakidajecca na chutary jak ułaśnik, pry čym rešta daŭhu raskładajecca na 40 hadoŭ, z apracentavańniem pa 3 prac. ŭ hod. I naadvarot, kali taki kandydat u hetym probnym časie nia sumieje vykazacca svaimi zdolnaściami da haspadaravańnia, dyk ad jaho chutar adbirajecca, a z zapłačanaj napierad $^{1}/_{4}$ vartaści chutaru adličajucca paniesienyja škody. Hetak zabieśpiačajucca švedy ad marnavańnia haspadarskaha dabra.

Mima ŭsio heta ednak, za prykładam inšych krajoŭ, i Švecyja siahońnia imknziecca ŭ ziemlarobstvie da samavystarčalnaści, a znača da padniaćcia vytvorčaści. Pry sučasnych formach vytvorčaści padniać jaje ŭžo ciažka. I tamu za apošnija dva hady viadziecca ŭ Švecyi akcyja, jakaja maje na mecie čym chutčej rasparcelavać majontki. Rachujuć pry hetym, što jak u inšych krajoch tak i tut chutarnaja haspadarka, u paraŭnańni z dahetulašniaj haspadarkaj bolšych i mienšych abšarnikaŭ, vytvorčaść ziemlarobskuju značna padvyša; nia tolki ŭ halinie žyviołahadoŭli, ale i ŭ vytvorčaści polnaj.

Hetak u ehulnych rysach pradstaŭlajecca žyćcio paŭnočnaj Švecyi, z jakoj biełarusy ŭ čas svajej poŭnaj niezaležnaści ŭtrymlivali žyvyja znosiny.

Jak chutka abarvanyja biaz našaj viny viazi spałučacca nanova?

V. K.

стае і цьвёрдае дно. У праціўным разе у балоцістым дне корм марна губляецца, бо рыба яго ня знойдзе.“

Гэтулькі аб фаховым прыгатаваньні і вядзеньні штучнага ставу паводле слоў успомненага аўтора. Дадаць да іх трэба, што рыбацтва ў нашых умовах жыцьця мае будучыню. Ім трэба толькі зацікавіцца. А тады і »няўжыткі“ могуць лёгка стацца капальняй дабрабыту.

А. К.

Вясьняныя хваробы жывёлы

По зіме жывёла наша часта выходзіць аслабленая і абяссіленая ад нястачы добрай пашы і ад таго, што цэлую зіму ня мела вольнага руху на чыстым паветры. Асабліва гэта шкодна для ўсякага маладняка, які западае на рахітызм (размякчэньне касьці), але шкодна яно і жывёле старшай, якая пры гэткіх варунках дастае ломкасьці касьцей; гэта й ёсьць прычына, чаму так часта вясной жывёла ломіць сабе ногі ці іншыя часьці з даўгімі касьцямі.

Звычайна ўсе запасы прызначаюцца ўзімку для кароў малочных. Коні ператрывалі зіму спачатку на канюшыне, сене, а пасьля—„як Бог даў“—на шчыра саламянай сечцы; пры канцы карміліі іх бульбаю, каб падмацаваліся перад самымі вясьнянымі працамі ў полі. Але ад бульбы коні хоць і гладзейшыя, то аднак слабейшыя, пры працы пацеюць, хістаюцца, ня маюць сілы. Гэткія і ім падобныя абразы спатыкаем у большасьці нашых перад усім дробных гаспадарак.

Усе цяпер чакаюць на тую хвіліну, калі можна ўжо выгнаць жывёлу на пасьбішча. Тут аднак, на выбоінах і выганах, пагражаюць жывёле новыя небясьпекі розных утаеных і яўных хваробаў, да якіх пасьля благой зімоўкі жывёла мае нахіл.

Гэтыя „вясьняна-сэзонныя“ хваробы маюць свой пачатак ня толькі ад лапчывага паяданьня раньніх сакавітых траваў (напр. нястраўнасьць, уздуцьцё, бягунка), але й ад напатканьня на пасьбішчы жыватвораў, каторыя ня раз маюць у сабе утоеныя, або й сусім яўныя хваробы. Гэтыя хваробы лёгка перакідаюцца на здаровую жывёлу, да якой ня мелі доступу, пакуль яна стаяла ў хляве.

Жывёла хворая пры гэтым, абнюхіваючы занячышчанае сваім калам пасьбішча ці йнакш датыкаючыся да жывёлы здаровай, заражае гэту апошнюю. Скаціна гэтак заражаецца сухотамі і крываўкай, авечкі — матыліцаю, коні — сапам (насацізнай), каростай, анэміяй, сьвіні —„крупамі“ (вуграватасьцю), чырвонкай, чумой (паморам), птушка—халераю.

Нястраўнасьцю (праносам) хварэе ў гэты час жывёла ня толькі ад раньняй травы на пасьбішчы, але на самае пасьбішча прыходзіць ужо хворая на бягунку ад зімоўкі на стухлым, сплесьніўшым сене, зацьвіўшым аўсе, загніўшымі буракамі, морхваю, на гнілой, парослай бульбе, зялёныя расткі каторай маюць у сабе сільна атрутную соляніну. Таксама ад брагі і пракіслых жмыхоў хварэе жывёла на хронічную бягунку.

Каб усьцерагчы жывёлу ад вясьняные нястраўнасьці, трэба на пасьбішча выганяць спачатку на час карацейшы, дапаўняючы кармленьне ў хляве пашаю сухою. У выпадках злоснай (упартай) нястраўнасьці, памагае адвар маладых дубовых растоў (сучкоў) або емялы (дзьве прыгаршчы аднаго ці другога на кварту варатку); памагае таксама адвар з сушаных чарніцаў (афінаў) у прапорцыі аднэй прыгаршчы на літр варатку. Добра йшчэ, калі дадаюць да гэтага чарку водкі. Гэта порцыя для скаціны дарослай; порцыя для маладняка павінна быць адпаведна меншай. Пакуль жывёла лечыцца, яе трэба трымаць у хляве, выпускаючы толькі на абход па панадворку, але не па пасьбішчы, дзе яна магла-б далей есьці зялёную пашу.

Пры доўгатрываючай бягунцы ў старшай жывёлы трэба праверыць адходы (кал), ці няма ў іх кароткіх (1—1 з паловай см) плоскіх рабачкоў. Гэта матылічнікі і жывёлу заражаную імі ня можна пускаць на супольнае пасьбішча, бо ад яе заразіцца рэшта жывёлы здаровай. Праўдападобнасьць матылічнікаў тым большая, калі жывёла пасецца на балоцістых ці толькі падмоклых пасьбішчах. Каб забясьпечыць жывёлу прад

матылічнікамі, ей падаецца прад выганяньнем быдлячая соль, якая забівае зародкі матылічнікоў яшчэ ў трыбусе.

Калі да бягункі далучаецца йшчэ кашаль, а сама жывёла хутчэй ці вальней худзее, дык можна падазраваць, што такая жывёла мае пачаткі сухотаў у стравэтраўчых органах. Гэткай жывёлы таксама ня можна пускаць на супольнае пасьбішча.

У кустох чакае на жывёлу крывапіўца клешч, які высасываючы з жывёлы кроў, улівае ей шкодніка піроплязму, ад каторай паўстае крывавая моч. Прысcаных кляшчоў ня можна вырываць сілком, бо гэта не паможа. Замест гэтага трэба тое месца дзе сядзіць клешч і яго самога памазаць бэнзынай ці нафтай, ад чаго клешч вылезе сам.

Вясной так-жа пашыраюцца сярод скаціны хваробы плоцевых органаў, бо ў гэту пару мясцамі йшчэ самапас гуляюць па стадах нікім некантраляваныя дармавыя стадніки. Гэтыя „стаднікі,“ акрамя таго што псуюць правільную жывёлагадоўлю, заражаюць яшчэ кароў рознымі хваробамі, ад якіх гэтыя каровы пасьля становяцца бясплоднымі.

Коні — заражаюцца абнюхіваючыся і чыхаючы. З хворых штук на здаровыя перакідаюцца: насацізна (сап), золзы, кароста і інш. Трапляецца гэта так-жа пры выпадковым спраганьні чужых коняў дзеля супольных цяжэйшых працаў у полі. Перш чым рашыцца на такое спраганьне, трэба ўпэўніцца, ці суседаў конь не здраджае хваробы ў форме выпаданьня поўсьці на шыі, вісках і на лобе. Або ці з храпаў не выплывае (пры сапе) зеленкаватая маса, часам з дамешкай сьлядоў крыві. Памятаць пры гэтым трэба, што закон вымагае, каб аб выпадках сапу паведамляліся вэтэрынарныя ўлады (праз гміну ці праз паліцыю).

Сьвіні заражаюцца на выганах — пасьбішчах, агародах і ўсюды там, куды пранікаюць ходзячы самапасам. Найчасьцей заражаюцца „крупамі,“ паядаючы людзкі кал, у якім і знаходзяцца зародкі солітэра. Доказ гэта йшчэ адзін, што добрыя зацішкі (адходныя мясцы) гэта ня выдумка „гарадзкіх паноў,“ а канешнасьць здаровага жыцьця. Таксама заражаюцца сьвіні адна ад другой — чырвонкаю і чумой, ад якіх масава гінуць.

Др. М. Ст.

Дзесяць прыказаньняў аб даеньні каровы

1. Кароўка гэта жывое стварэньне; добрае абходжаньне з ёй, аблегчыць працу і запэўніць большую колькасьць малака.

2. Кароўка гэта жывая фабрыка, якая карыстаньнем дасканаліцца:

а) Трэба яе добра выдойваць! Дзякуючы добраму даеньню разьвіваецца вым'я і ўспамагаецца ягоная чыннасьць.

б) Добра выдойваючы, атрымоўвуем клусьцейшае (тучнейшае) малако, таму што малако, якое выдойваецца з вым'я апошнім, мае ў сабе больш туку, чым малако выдойванае першым.

3. Трэба даіць добра, правідлова, спраўна:

а) Схапі вым'я ўсей рукой.

б) Пацiснуўшы добра вым'я, выцісьні малако.

в) Не забудзься ўціснуць дэлікатна руку на гару ў вым'я.

г) Не перарывай даеньня, калі малако льецца з вым'я.

д) Не забудзься выдаіць малака да апошняй каплі.

е) Калі ты гатоў (гатова), дык пагладзь папрыяцельску кароўку.

4. Чыстасьць пры даеньні.

а) Трэба даіць толькі ў чыстае начыньне. Пасьля карыстаньня начыньне трэба добра вычысьціць, вымыць і схаваць ў месца, дзе няма пылу, мухаў і дзе шмат сьвежага паветра.

Дасканальнае выветрываньне начыньня гэта адзін з галоўных варункаў чыстасьці.

б) Трэба мыць рукі перад і падчас працы.

в) Трэба заўсяды быць чыста і практычна апранутым.

г) Трэба даіць чыстымі сухімі рукамі. Перад даеньнем вычысьціць на суха каровінае вым'я і свае рукі.

д) Зараз-жа пасьля даеньня трэба ўзяць малако з хлява і перацадзіць яго праз добрую цадзілку.

е) Бруд, які затрымліваецца на цадзілцы, трэба чысьценька сабраць і выкінуць, таму, што можа распусьціцца ў малацэ і забрудзіць яго. Самую цадзіл-

ку па кожным ужываньні трэба вымыць у цёплай вадзе і да чыста выпаласкаць.

ж) Малако ад хворай каровы і ад кароў у першых пяці днёх пасьля цяляці піць ня можна. Так сама ня прыгодным да піцьця ёсьць малако кароў перад цяленьнем.

5. Ці здаровае вым'я?

Зараз шукай помачы:

а) Калі воцічупам знайдзеш на вым'і нарасьць,

б) Калі цяжка доіцца, ці калі зусім ня доіцца, хоць павінна даіцца.

6. Старайся як мага найлепш даіць. Кожны, хто доіць, ёсьць скарбнікам, які прыймае для сябе ці для свайго гаспадара грошы, таму што малако мае цану грошаў.

7. Абходжаньне з малаком.

Добра працэджанае малако трэба зараз-жа халадзіць, але не ў хляве.

а) Калі няма лядоўні, у якой малако вельмі добра халодзіцца, дык трэба паставіць конаўку ці збан з малаком зараз-жа ў ваду. У першую гадзіну пасьля даеньня трэба перамяніць ваду найменш тры разы. Пры гэтым малако ў конаўках, гарлачох, збанох, стаўбунох, гладышох трэба добра перамяшаць

б) Добра астуджанае малако можа быць толькі на тры ступні (градусы) цяплейшае за сьвежую крынічную ваду.

в) Малако трэба схаваць на сьцюдзённым месцы, на здаровым, сьвежым паветры.

г) Конаўкі з малаком (збаны) можна зачыняць (прыкрываць) толькі тады, як малако астыне. Трэба сьцерагчы малако ад пылу і ўсякіх мух. Калі надоенае малако трэба куды перавозіць, дык ставіць яго трэба на вазе так, каб яно як найменш траслося і ня мерзла.

д) Каб малако было чыстае і здаровае, трэба глядзець, каб у яго не трапілі розныя хваробныя заразкі, якіх поўна ў нячыстым (брудным) паветры хлява, у брудзе на вым'і, у саломе, у гнаі, у нячыстым брудным начыньні урэшце ў неправетраных хатах. Размнажываньня гэтых заразкаў, трапіўшых міма ўсё ў малако, можамо не дапусьціць толькі чыстым паветрам і нізкай тэмпэратурай. Таму:

8. Трэба старацца, каб ў хляве, у сьпіжарцы ці каморы было стала чыстае, здаровае паветра, тымбольш перад даеньнем.

9. Трэба трымаць каровы ў чысташці, а таму трэба шмат і добра падсьцілаць і правідлова іх чысьціць.

10. Даіць карову можа толькі здаровы чалавек, таму што малаком можна лёгка перадаць розныя заразныя хваробы.

З чэскага пераклала

Др. мэд. М. Г.-Бучынская.

Аб арэнднай умове

Аб арэнднай умове пастанаўляе „Кодэкс Забавязаньньняў“, арт. 402—418. Паводле гэтых праўных нормаў той, хто здае нешта ў арэнду, павінен даць арэндатару на ўжываньне і карыстаньне якуюсь рэч ці права маемасьці, асабліва права вытворства і забіраньня пладоў ягоных на час азначаны ці неазначаны, за аплатай умоўленай арэнды (чыншу); пры гэтым арэнда можа быць азначана ў грашох, або ў рэчах заменных, напр. у збожы ці часьці іншых прадуктаў выробленых з арэндаванага аб'екту (напр. з гаспадаркі, крамы ці нечага падобнага).

Абавязвае пастанова, што **арэндная ўмова павінна рабіцца на час азначаны, даўжэйшы як год, павінна быць зроблена на пісьме** (а ня вусна, хоць-бы і пры сьведках) Арэнда на больш як 30 гадоў уважаецца па ўплыве гэтага часу як арэнда зробленая на час неазначаны.

Арэндную ўмову, зробленую на пісьме, паводле абавязуючых законаў, трэба **найпазьней цераз тры тыдні** прадставіць скарбовым уладам дзеля аштэмпляваньня.

На выпадак калі арэнда абыймае гаспадарскі інвэнтар, тады арэндатар павінен утрымоўваць гэты інвэнтар паводле вымаганьняў правільнае гаспадаркі. Калі ўмова абыймае інвэнтар жывы, напр. коні, скаціну і г. д., дык арэндатар павінен іх утрымоўваць, замяняючы штукі старэючыя штукамі маладымі ў граніцах магчымасьцяў звычайнай гаспадаркі.

Рэмонт, які палучаны з звычайным ужываньнем прадмету арэнды у гаспадарцы земляробскай, напр. дарогі, масты, платы, студні, будынкі жылыя і інвэнтарскія — абцяжвае арэндатара.

Арэндатар павінен карыстацца з прадмету арэнды паводле вымогаў правільнай гаспадаркі. Пры арэндзе поля арэндатар павінен трымаць адпаведні жывы й мёртвы інвэнтар, а так-жа самае поле адпаведна абрабляць і ўгнаіваць.

На выпадак калі арэндатар не датрымоўвуе варункаў арэнднай умовы, уласьнік мае права падавацца ў суд, каб умову скасаваць.

Калі срок платы чыншу (арэнды) не ўстаноўлены ані ў умове ані мясцовым звычаем, дык знача гэта, што плаціць яго трэба паўгоднімі часткамі (ратамі) здолу.

У разе асаблівых выпадкаў, як суша, бура, град і г. п., якія звычайны прыход з арэндаванага аб'екту значна абніжаюць, тады пры кароткасрочнай арэндзе суд можа адпаведна абніжыць чынш, які прыпадае на гэты ж час. Інакш кажучы ў названых выпадках арэндатар можа праз суд дамагацца абніжэньня арэнды, калі ўласьнік ня згодзіцца на гэта дабравольна.

Калі ў умове не ўстаноўлены дакладны срок арэнды — адказаць яе можна на год згары, найпазьней прад пачаткам арэнднага году з тым, што арэнда кончыцца з канцом гэтага-ж году; калі-ж умова была зроблена на час прадбачаны, тады яе можна адказаць найпазьней на 6 мес. прад канцом арэнднага году.

Як скончыцца арэнда, арэндатар, калі ня было іншай умовы, павінен уласьніку вярнуць прадмет арэнды ў такім стане, які адпавядае правідловай гаспадарцы.

Калі арэндатар атрымаў інвэнтар з абавязкам звароту паводле вартасьці шацунковай, устаноўленай пры пачатку арэнды, павінен вярнуць гэты інвэнтар у такім-жа стане і ў такой шацунковай вартасьці. Убытак шацунковай вартасьці павінен вынагарадзіць, але калі акажыцца надвыжка, дык сам арэндатар можа жадаць звароту.

Арэндатар не адказвае за страты з прычыны ўласьніка або спрычыненыя сілай вышэйшай.

Усе прэтэнсыі з тытулу арэнды вырашае суд у звычайным поступе для справаў цывільных.

(„Zjedn.")

Прад сенакосам.

Ёсьць у гаспадарцы рэчы аб якіх трэба ня то што гаварыць і пісаць, але на ўвесь голас крычэць, і то ня толькі праз адзін дзень, тыдзень ці месяц, але праз некалькі гадоў пад рад. Гэткай ёсьць сіла закаранелай прывычкі, каторую прыходзіцца пераломываць.

Колькі ўжо пісала „Самапомач" аб тым, як канешным ёсьць, каб ніводзін кусок аржышча не аставаўся на зіму незааранымі!? Колькі не гаварылася аб патрэбе раньне-вясеньняга валачэньня ральлі сумыснай снасьцю званай валачылам?! Усё гэта аднак, трэба сказаць праўду, знаходзіць застасаваньне ў лічаных толькі выпадках. Уся-ж рэшта людзей, да каторых дайшлі гэныя заклікі, адкладае чутае „да лепшага часу". А калі з гэткае свае апяшаласьці церпіць страты, дык гатова прыпісаць іх усяму іншаму на сьвеце, толькі не сабе. Тут „вінаваты": пагода, мароз, сьпякота і г. д, словам — усё, толькі ня „Я". Іх нават не пераканае сёлетняя сухая вясна, якая ў першую чаргу якраз даецца востра адчуць іменна такім гаспадаром адсталым, і значна менш пагражае такім, якія ў пару зразумелі, што гэта знача гаспадарна абходзіцца з зімовай вогкасьцю. Аб усім гэтым пісалі мы апошні раз у леташняй „Самапомачы" (№ 3) і таму тут паўтарацца ня будзем. Успомнім-жа тут аб іншым занядбаньні: аб зарастаньні палёў і сенажацяў пустазельлем і аб сыстэматычным спазьняньні касьбы на сенажацях.

Аб гэтых справах „Самапомач" у сваім часе ўжо таксама пісала. Вернемся да іх у колькі славах дзеля таго, што цяпер якраз надыходзіць адпаведні да гэтага час.

„Пустазельле гэта абжора" нашых бедных палёў. Пануе аднак устарэлае пераканаьне, што „ўсё зялёнае — гэта трава" і таму пустазельле высысае з глебы літасальна апошнія сокі, а гаспадарскія расьліны галадуюць. Раз яшчэ зазначаем, што ўсё пустазельле з палёў і агародаў трэба да чыста выбіраць і нішчыць. Пры гэтым пустазельле тады толькі зьнішчыцца, калі за яго ўзяцца прад расьцьвітаньнем. Усё роўна ці гэта на сенажаці ці на ворным полі.

Урэшце да справы самае касьбы. Укарэніўся пагляд, што чым больш

Pierasyłka apłačana ryčałtam.

Гаспадарская хроніка

Мэліорацыя ў Наваградчыне. На абшары Наваградчыны ад 1929 да 1938 г. было зьмэліоравана агулам 54.752 га, з чаго: 35 прац. сенажацяў тарфяністых, 25 прац. сенажацяў мінэральных, 15 прац. няўжыткаў. 10 прац. пасьбішчаў і 15 прац. ворнага поля. Да зьмэліораваньня астаецца йшчэ 400.000 га, а да самага дрэнажаваньня (асушаньня) яшчэ каля 300.000 га. На перашкодзе дальшаму мэліораваньню стаіць недастатак грошаў у мясцовага насельніцтва, якое даўгі час дарма чакае на абяцаную помач з боку ўраду.

Мытныя каморы (цэльныя) на літоўска-польскай граніцы ужо заснаваны пры чыгунках з Ляндварова ў Еўе і з Уцянаў у Нова-Сьвянцяны. У недалёкім часе маюць быць адчынены такія-ж каморы пры вялікіх трактах: Кальварыя-Сувалкі, Шырвінты-Вільня, Азяросы-Смольвы, Салокі-Дукшты, Лабанары-Калтыняны, Янішкі-Падбродзе. Пшэлае-Ораны і Мусьнікі-Мэйшагола.

Нашы коні і зёлкі ідуць заграніцу. Астатнім часам у Англію, Бэльгію, Данію, Голяндыю і Швэцыю было вывезена 546 штук рабочых коняў. На ўсіх гэтых рынках з Віленшчынай моцна конкуруе Літва. — З тэй-жа Віленшчыны і Наваградчыны за м-ц сакавік было прададзена 42.800 клг. усякіх лекарскіх зёлак.

»Кулкі« купляюць ваенныя караблі. Прадстаўнікі Цэнтральных Варшаўскіх уладаў земляробскіх „кулкаў“ былі анагдай на прыняцьці ў Прэзыдэнта Р. П., якому заявілі, што на рахунак сарганізаваных „кулкаў“ купляюць сёлета для ваеннай польскай флёты два лёгкія баевыя караблі, г. зв. „сьцігачы“ (ад слова „сьцігаць,“ якое азначае „даганяць.“

Пошта ў Літву. Ад 10-га мая сёл. пачаўся правільны паштовы абарот Польшчы з Літвою. Пісьмо звычайнае ў Літву каштуе 55 грашоў, а паштоўка — 30 грашоў. Наладжана так-жа спалучэньне тэлефонічнае і тэлеграфічнае.

зьбярэ гаспадар з сенажаці зялёнай масы, тым лепш. Не зварочваецца пры гэтым увага на тое, якая гэта „маса“: ці гэта сапраўднае сена, ці нешта толькі да сена больш ці менш падобнае. Кожны гаспадар-земляроб ведае, што сена з маладой сочнай травы будзе лепшым, чым сена з травы старэйшай, часта зьдзеравянеўшай і высахшай ужо на пні. І міма таго аднак кожны адкладае касьбу на пазьней, каб трава „падрасла“, каб дала „болей“ сена. І тут якраз пачынаецца самаабман, бо чалавек зьбярэ, праўда, самай масы больш, але гэта будзе ўжо ня сена, а звычайная салома. А апрача таго, травы перарошчаныя на пні вельмі сільна і непатрэбна вынішчаюць кармавыя запасы самай сенажаці. Таму яшчэ раз кідаемо агульны заклік да нашага сялянства як найраней касіць сваё сенажаці; найпазьней — у пару красаваньня большасьці траваў, але лепш, калі гэта зробіцца яшчэ раней. А на тое, каб травы мелі даволі часу на рост, трэба сенажаці сьцерагчы ад спасываньня іх познай вясной.


С. Я—віч.



Прысланыя кніжкі

В. Січинський: Нариси з історіі української промисловости. Бач. 104. Львоў, 1938.

Ол. Бережницька Будзова: Квітник селянки. Бач. 63. Львоў, 1938 — Гэта ёсьць вельмі карысная кніжыца для кожнага, хто хоча разумна сарганізаваць гародчык з кветкамі каля сваё хаты. Кніжка напісана проста і зразумела.



„Самапомач“ выходзіць раз на месяц

ПАДПІСКА на „Самапомач“: на год — 3 зл. Асобны нумар 30 грашоў. Пры выпісваньні на адзін адрэс прынамся 5-цёх экзэмпляроў — па 2 зл. за нумар на цэлы год (за 5 штук 10 зл., а за 10 шт. — 15 зл.).Цэны абвестак паводле ўмовы. Грошы перасылаць „разрахунковым пераказам“ на картотэку № 40. Усякія пісьмы адрэсаваць у рэдакцыю: Вільня, Завальная 1.

Рэдакцыя адчынена штодзень ад гадз. 13 да 15.

Рэдактар Інж. А. КЛІМОВІЧ. Выдавец: „БЕЛПРЭС“

Беларуская Друкарня ім. Фр. Скарыны ў Вільні: Завальная 1.